Created in Master PDF Editor - Demo Version

Международная «Лига развития науки
и образования» (Россия)
Международная ассоциация развития науки,
образования и культуры России (Италия)

Институт управления (г. Архангельск, Российская Федерация)
Миланский государственный университет (Италия)
Международный университет «МИТСО» (Беларусь)
Белорусский государственный педагогический университет им. М. Танка
Витебский государственный технологический университет (Беларусь)
Минский государственный высший
радиотехнический колледж (Беларусь)
Восточно-Казахстанский государственный университет
им. С. Аманжолова

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# БЕЛАРУСЬ, КАЗАХСТАН, РОССИЯ: ВРЕМЯ ИННОВАЦИЙ

Сборник материалов
международной научно-практической конференции
17–18 апреля 2014 г., г. Архангельск
В 2 частях
Часть 2. Секции 4–8

Научный редактор – почетный работник высшего
профессионального образования Российской Федерации,
почетный работник юстиции России, академик РАЕН,
доктор экономических наук, профессор
**А.Н. Ежов**

АРХАНГЕЛЬСК
Институт управления
2014

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

УДК 321.01+338
ББК 6/8в
Б 43

**Заместитель научного редактора** – ректор Международного университета «МИТСО», доктор юрид. наук, проф. **С. Н. Князев**

**Главный редактор** – доктор экон. наук, проф. **А. Е. Кальсин**

**Заместители главного редактора:** заслуженный юрист Российской Федерации, почетный работник высшего профессионального образования РФ, почетный работник юстиции России, доктор юрид. наук, проф. **А. С. Самойлов;** директор издательства ИУ **Н. А. Голикова**

**Редакционная коллегия:** президент Международной ассоциации развития науки, образования и культуры России, преподаватель Миланского государственного университета проф. **Т. Пиццикеми;** ректор Витебского государственного технологического университета доктор техн. наук, проф. **В. С. Башметов;** ректор Восточно-Казахстанского государственного университета им. С. Аманжолова доктор экон. наук, проф. **А. У. Кувандыков;** ректор Минского государственного высшего радиотехнического колледжа канд. пед. наук, доцент **С. Н. Анкуда;** и. о. ректора Белорусского государственного педагогического университета им. Максима Танка канд. пед. наук, доцент **А. И. Андарало;** проректор по научной работе Института управления, доктор экон. наук, проф. **Д. С. Вахрушев;** доктор юрид. наук, проф. **В. О. Миронов;** проректор по международным, межрегиональным отношениям и связям с общественностью Института управления **М. П. Соболев;** проректор по научно-исследовательской работе ИУ канд. пед. наук, доцент **З. Г. Облицова;** проф. ИУ канд. экон. наук **С. Е. Жура;** проф. ИУ канд. экон. наук **К. Л. Михайлов;** проф. ИУ канд. экон. наук **Н. В. Зыкова;** проф. ИУ канд. юрид. наук **Н. А. Селяков;** проф. ИУ канд. ист. наук **О. В. Чуракова;** проф. ИУ канд. филол. наук **Е. В. Костеневич;** проф. ИУ **Н. Я. Фалилеев**

*Печатается по решению редакционно-издательского совета ИУ*

Б 43 **Беларусь, Казахстан, Россия: время инноваций** : сборник материалов международной научно-практической конференции 17–18 апреля 2014 г., г. Архангельск. В 2 частях. Часть 2. Секции 4–8 / науч. ред. проф. А. Н. Ежов. – Архангельск : Институт управления, 2014. – 248 с.
ISBN 978-5-8382-0705-0

В сборнике представлены работы ученых, преподавателей, аспирантов, студентов вузов и специалистов-практиков.

Статьи сборника отражают основные проблемы внедрения инноваций на государственном уровне.

The collection presents the articles of scientists, lecturers, post-graduates, students and practical specialists. The articles reflect the main problems of implementation of innovations at the govenmental level.

УДК 321.01+338
ББК 6/8в

ISBN 978-5-8382-0705-0

© Авторы статей, 2014
© НОУ ВПО «Институт управления», 2014

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version



УДК 378

***П. А. Мацюш,*** *кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі, загадчык навукова-даследчага сектара Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*
*г. Мінск*

# РЭГІЯНАЛЬНЫЯ АСПЕКТЫ СТАНАЎЛЕННЯ І РАЗВІЦЦЯ ВЫШЭЙШАЙ ГІСТАРЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ Ў СССР У СУЧАСНЫХ БЕЛАРУСКІХ І РАСІЙСКІХ ДАСЛЕДАВАННЯХ

*Рэгіянальныя аспекты, гістарычнай адукацыі*

Гістарычная адукацыя – гэта спецыяльная галіна ведаў. Яна з'яўляецца найбольш істотным элементам гуманітарнай падрыхтоўкі і выхавання маладога пакалення, фарміравання нацыянальных, агульнадзяржаўных ідэалагічных арыенціраў, грамадзянскай самасвядомасці народа.

За апошнія дзесяцігоддзі змяніліся метадалагічныя падыходы ў даследаваннях. Зніклі многія ідэалагічныя стэрэатыпы, з'явіліся нестандартныя ацэнкі, павялічылася кола ўведзеных у навуковы ўжытак крыніц, пашырыўся выбар метадаў даследавання.

Аналізуючы беларускія даследаванні, варта звярнуць увагу ў першую чаргу на дысертацыі, якія былі абаронены за апошнія гады. Так, у даследаванні Л.А. Маторавай «Развитие исторического образования в системе высшей школы Беларуси. 1944–1961 гг.» [2] аўтарам раскрываецца развіццё гістарычнай адукацыі ў кантэксце сацыяльна-палітычных працэсаў у савецкім грамадстве ў пасляваенны час і дзяржаўнай палітыкі БССР у вышэйшай школе. Дысертацыя пабудавана па праблемна-храналагічным прынцыпе, і вывучэнне пытанняў развіцця гістарычнай адукацыі звязваецца з пераменамі, якія адбыліся ў савецкім грамадстве пасля смерці І. Сталіна і XX з'езда КПСС. Даследчыкам даказваецца, што мадэль гістарычнай адукацыі ў сістэме вышэйшай школы БССР была сродкам ідэалагічнай палітыкі партыі. Гэта акалічнасць непасрэдна ўплывала на яе змест. Савецкі перыяд

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version



вывучаўся больш падрабязна ў параўнанні з дасавецкім, тым самым сцвярджалася, што «сапраўдная» гісторыя пачыналася толькі пасля кастрычніка 1917 г., а да гэтага была перадгісторыя.

Даследчык сцвярджае, што змест гістарычнай адукацыі вызначаўся галоўным чынам сацыяльным заказам з боку дзяржавы, а не аб'ектыўным станам гістарычнай навукі [2, арк. 45].

У дысертацыі, тым не менш, адсутнічаюць абагульняльныя даныя аб колькасці настаўніцкіх і прафесарска-выкладчыцкіх кадраў гісторыкаў, падрыхтаваных у сістэме вышэйшай школы Беларусі ў разглядаемы перыяд, колькасці і тэматычным размеркаванні навуковых даследаванняў па гісторыі. Вынікі праведзенага даследавання аўтарам прадстаўлены у навуковых публікацыях.

У даследаванні В. П. Вірскай «Формирование новой концепции истории Беларуси в системе средней общеобразовательной школы (1986–1990-е гг.)» [1] крытычнаму аналізу падвергнута мадэль прафесійнай падрыхтоўкі настаўнікаў гісторыі ў БССР, якая пачала фарміравацца яшчэ ў 30-я гг. XX ст. Аўтарам указана на жорсткія метадалагічныя рамкі і адсутнасць паўнавартасных умоў для варыятыўнага навучання і выхавання сродкамі гісторыі, існаванне параўнальна невялікіх адрозненняў у праграмах па гісторыі для сярэдняй школы і ВНУ, аб'ектыўныя абмежаванні ў вывучэнні гісторыі Беларусі, негатыўны ўплыў дагматызму і схаластыкі на грамадскую свядомасць спецыялістаў-гісторыкаў у акрэслены час [1, с. 74–75].

Пытанні навуковай арганізацыі, планавання і ўдасканалення навукова-даследчай дзейнасці навукова-педагагічных кадраў гісторыкаў, развіцця навукі і ўдасканалення вучэбна-выхаваўчага працэсу на гістарычных факультэтах беларускіх ВНУ асвятляліся ў артыкулах і навуковых тэзісах М. П. Касцюка, А. П. Ігнаценкі, П. З. Савачкіна, І. В. Царук, Л. Шнеерсона, Г. М. Ліўшыца, Б. М. Фіха, І. П. Крэня, В. М. Фаміна, У. В. Тугая, П. Ф. Дзмітрачкова, С. М. Ходзіна, В. І. Менькоўскага і інш.

На працягу апошніх гадоў на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі абаронены шэраг дысертацый, прысвечаных развіццю гістарычнай адукацыі ў межах асобных рэгіёнаў Расіі. Вылучэнне асобнага рэгіёна Расійскай Федэрацыі ў якасці геаграфіі даследавання не страчвае сваёй актуальнасці і для Беларусі. У СССР працяглы перыяд існавала ўніфікаваная сістэма падрыхтоўкі спецыялістаў. Уся краіна займалася па адзіных вучэбных планах, нягледзячы на пэўны рэгіянальны кампанент. Пры пэўным несупадзенні геаграфіі даследавання ў працах разглядаецца аднолькавае кола праблем, што тлумачыцца блізкасцю даследчых задач.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version



У доктарскай дысертацыі А. Г. Цімафеевай «Государственная политика в сфере обществоведческого образования российской молодежи в 50-е – 90-е гг. XX в.» [4] асобная глава прысвечана вывучэнню гуманітарных і грамадска-палітычных дысцыплін у 1960-х – першай палове 1980-х гг. Аўтарам раскрываюцца дзяржаўныя падыходы да вызначэння зместу названай галіны ведаў у вышэйшай школе СССР. Даследчык прыходзіць да высновы, што ўніфікацыя вучэбнага працэсу, якая праяўлялася ў стварэнні адзіных вучэбных планаў і праграм, з аднаго боку, прывяла да пераемнасці ў вывучэнні грамадскіх дысцыплін, з іншага – да «фармалізму і абязлічвання вучэбнага працэсу». Такое імкненне да ўніфікацыі вынікала з пазіцыі партыйнага кіраўніцтва, якое было незадаволена пераглядам партыйнай гісторыі і «з'яўленнем дыскусій па пытаннях, даўно вырашаных навукай». Гэта праяўлялася ў выпраўленні зместу вучэбнай літаратуры, стварэнні стабільнага падручніка па гісторыі КПСС «на доўгі час», які б правільна адлюстроўваў партыйную лінію, замест разнастайных дапаможнікаў з мноствам трактовак [4, арк. 163].

Расійскім даследчыкам А. М. Церахавым у 2003 г. была абаронена кандыдацкая дысертацыя на тэму «Становление и развитие высшего исторического образования на Южном Урале (1934–1993 гг.)» [3]. Аўтарам праведзена грунтоўная праца па сістэматызацыі і аналізе шырокага кола крыніц і вылучэнні асноўных этапаў гістарычнай адукацыі ў ВНУ Паўднёвага Урала. Аднак працяглы храналагічны перыяд даследавання прывёў да нераўнамернага разгляду асобных праблем і перыядаў тэмы. Недастаткова ў даследаванні паказана эвалюцыя дзяржаўнай палітыкі ў галіне гістарычнай адукацыі і падрыхтоўкі кадраў гісторыкаў.

Развіццю гістарычнай адукацыі як у асобным расійскім рэгіёне, так і на тэрыторыі ўсёй краіны прысвечаны даследаванні К. А. Ушмаевай «Основные этапы и особенности развития исторического образования в вузах России (20–90-е годы XX века)» [5] і «Развитие высшего исторического образования на Северном Кавказе с 1945 по 2000 гг.: по материалам Дона, Кубани и Ставрополя» [6]. Доктарская і кандыдацкая дысертацыі ахопліваюць працяглы храналагічны перыяд. У даследаваннях К. А. Ушмаевай праводзіцца грунтоўны аналіз пытанняў развіцця вышэйшай гістарычнай адукацыі ў розных рэгіёнах Расіі. Аўтарам паказваецца значэнне грамадскіх і спецыяльных гістарычных дысцыплін у фарміраванні грамадзянскай свядомасці будучага спецыяліста. Праз аналіз вучэбных планаў, праграм, вучэбнай літаратуры прасочваецца

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version



эвалюцыя зместу гістарычнай адукацыі, паказваецца яе залежнасць ад канкрэтных грамадска-палітычных умоў.

Такім чынам, вышэйшая гістарычная адукацыя ў СССР як аб'ект навуковага даследавання і на сённяшні дзень выклікае інтарэс у даследчыкаў. Невыпадкова, што за апошні час у беларускай і расійскай гітарыяграфіі з'явіліся працы, якія раскрываюць шматлікія рэгіянальныя аспекты названай тэмы.

Найбольш поўна ў беларускіх і расійскіх даследаваннях разгледжаны пытанні падрыхтоўкі настаўніцкіх і навукова-педагагічных кадраў гісторыкаў, прааналізаваны структура, формы і змест вышэйшай гістарычнай адукацыі.

Такім чынам, стан навуковых даследаванняў па названай тэме характарызуецца грунтоўнай гістарыяграфічнай базай, але адсутнасць комплекснага яе вывучэння айчыннымі і замежнымі гісторыкамі стварае аб'ектыўныя ўмовы для правядзення адпаведнага даследавання.

## Літаратура

1. *Вирская, В. П.* Формирование новой концепции истории Беларуси в системе средней общеобразовательной школы (1986–1990-е гг.) : дис. ... канд. ист. наук : 07.00.02 / В. П. Вирская. – Минск, 2004. – 152 л.

2. *Моторова, Л. А.* Развитие исторического образования в системе высшей школы Беларуси, 1944–1961 гг. : дис. ... канд. ист. наук : 07.00.02 / Л. А. Моторова. – Минск, 2002. – 114 л.

3. *Терехов, А. Н.* Становление и развитие высшего исторического образования на Южном Урале, 1934–1993 гг. : дис. ... канд. ист. наук : 07.00.02 / А. Н. Терехов. – Челябинск, 2003. – 222 л.

4. *Тимофеева, Е. Г.* Государственная политика в сфере общественного образования российской молодежи в 50-е – 90-е годы XX века : дис. … д-ра ист. наук : 07.00.02 / Е. Г. Тимофеева. – Астрахань, 2004. – 500 л.

5. *Ушмаева, К. А.* Основные этапы и особенности развития исторического образования в вузах России: 20–90-е годы XX века : дис. … д-ра ист. наук : 07.00.02 / К. А. Ушмаева. – Пятигорск, 2011. – 562 л.

6. *Ушмаева, К. А.* Развитие исторического образования на Северном Кавказе с 1945 по 2000 гг. : по материалам Дона, Кубани, Ставрополья : дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / К. А. Ушмаева. – Ставрополь, 2004. – 330 л.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version